provided by Belarusian State Pedagogical University Repo

# ГІСТОРЫЯ

*УДК 947.6«1859/1903»*

*С.А. Талмачова,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ*

## ПРАБЛЕМА ПРАВЯДЗЕННЯ ЗЕМСКАЙ РЭФОРМЫ Ў БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯХ (1859-1903 гг.)

З'яўленне ў другой палове XIX ст. земскіх органаў самакіравання было абумоўлена аб'ектыўнымі прычынамі. Краіна пасля адмены прыгону адчувала патрэбу ў стварэнні структур гаспадарчага і сацыяльна-бытавога кіравання. З гэтага пункту гледжання, у рэформе мясцовага кіравання аб'ектыўна была зацікаўлена сама ўлада. Аднак увядзенне земстваў на тэрыторыі Беларусі адтэрміноўвалася ў сувязі з падзеямі, што адбываліся ў яе межах. У дарэвалюцыйнай, савецкай і постсавецкай літаратуры галоўная ўвага надавалася асаблівасцям увядзення зем стваў у Паўночна-Заходнім краі. Аднак барацьба вакол рэалізацыі рэформы ў беларускіх губернях у 1859-1903 гг. не з'яўлялася предметам спецыяльнага даследавання.

Земская рэформа ў Расійскай імперыі праводзілася з 1864 г. Думка аб неабходнасці ўтварэння асаблівых органаў мясцовага гаспадарча-распараджальнага кіравання ўзнікла аднача сова са складаннем палажэнняў аб вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці і ўпершыню была абвешчана 25 сакавіка 1859 г. царскім указам. 23 кастрычніка 1859 г. было загадана скласці праект пераўтварэння губернскага кіравання і пры гэтым вызначыць ступень удзелу ў ім кожнага саслоўя. Выкананне гэтай задачы ўскладалася на камісію аб губернскіх і паветовых установах пад кіраўніцтвам спачатку М.А. Мілюціна, а пазней - міністра ўнутраных спраў П.А. Валуева.

15 сакавіка 1862 г. у Савет міністраў быў прадстаўлены для абмеркавання праект Палажэння аб земскіх установах, які затым быў разгледжаны і выпраўлены ў асобай нарадзе Савета міністраў пад старшынствам вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча. 2 ліпеня 1862 г. галоўныя палажэнні земскай рэформы былі адобраны Аляксандрам II і надрукаваны для азнаямлення.

Гэтыя падзеі набылі значны грамадскі рэзананс. Так, шэраг дваранскіх сходаў (Маскоўскі, Пецярбургскі, Наўгародскі, Тульскі, Смален скі) хадайнічалі аб увядзенні шырокага прадстаўніцтва насельніцтва ў земстве. Аднача-сова з рухам за ўсенароднае прадстаўніцтва ў губернях, у Польшчы і Заходнім краі ішла мэтанакіраваная агітацыя на карысць Канстытуцыі. Яшчэ 28 лютага 1861 г. у Варшаве польскія землеўладальнікі падалі цару адрас, у якім адзначалася «векавая звычка палякаў да вольных устаноў», аб адсутнасці ў краі ўсякага легальнага органа, праз які народ меў бы магчымасць «непасрэдна гаварыць трону і абвяшчаць свае пажаданні і патрэбы», аб тым, што «ў сям'і народаў еўрапейскіх толькі адзін польскі народ пазбаўлены вольных устаноў». 29 лістапада 1862 г. мінскія дваране ў адрасе на імя цара хадайнічалі «аб далучэнні літоўскіх губерняў да Польшчы і прасілі ўстаноў, якія ўласцівы духу народа польскага» [1, с. 64-65]. Зразумела, такая пазіцыя дваранства непакоіла ўрадавыя колы.

26 мая 1863 г. праекты былі абмеркаваны ў Дзяржаўным савеце. Пры гэтым міністр унутраных спраў П.Д. Валуеў планаваў распаўсюдзіць праектуемае ўладкаванне на ўсе 44 губерні, якія кіраваліся на агульных умовах, у тым ліку і на дзевяць заходніх. Дзяржаўны Савет пагадзіўся з асноўнымі палажэннямі даклада П.А. Валуева, аднак вырашыў затрымаць распаўсюджанне новага заканадаўства на заходнія губерні. Было прынята рашэнне ўзгадніць пытанне аб часе і сродках увядзення Палажэння аб земскіх установах з мясцовымі генерал-губернатарамі.

1 студзеня 1864 г. Палажэнне аб земскіх установах набыло сілу закона, уступіла ў дзеянне спачатку ў 33 губернях. Пры гэтым міністру ўнутраных спраў было даручана скласці меркаванні аб сродках і парадку прымянення азначанага закона ў губернях Архангельскай, Астраханскай і Бесарабскай, а таксама аб часе і сродках увядзення яго ў 9 заходніх губернях. На працягу 1865-1876 гг. земскія ўстановы былі ўведзены ў 34 губернях еўрапейскай Расіі і ў вобласці Войска данскога (з 1882 г. дзеянне Палажэння тут адменена) [2].

Што датычыцца Заходняга краю, то ў адказ на запыт П.Д. Валуева Віленскі генерал-губернатар М.М. Мураўеў адзначыў: «Агульны выбарны парадак, пакладзены ў падмурак земскіх устаноў, паставіў бы ўсё гаспадарчае кіраванне ў залежнасць ад ... дваранства, дробнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шляхты і гарадскога саслоўя польскага паходжання і рымска-каталіцкага веравызнання і гэтым падпарадкавала б і сялянскае саслоўе іх уплыву, якое палякі … выкарысталі для шкоды нашай...». Таму М.М. Мураўёў лічыў, што «земскія ўстановы не маглі яшчэ быць прыведзены ў дзеянне» ў беларускіх губернях [3, л. 1]. З гэтай прычыны Дзяржаўны савет прызнаў немагчымым увесці земскія ўстановы на ўсёй тэрыторыі краю і пры гэтым прапанаваў міністру ўнутраных спраў узгадніць час і сродак увядзення Палажэння ў заходніх губернях.

Такім чынам, на Беларусь палажэнне аб земствах не распаўсюджвалася. На думку М.М. Забаўскага [4], тлумачылася вышэйадзначанае тым, што хоць правы земстваў і былі даволі абмежаванымі, аднак гэта быў адзіны ў Расіі дзяржаўны інстытут, які грунтаваўся на выбарным пачатку і ў некаторай ступені даваў магчымасць праявіцца грамадскай самадзейнасці. Механізм выбараў у земскія ўстановы быў абумоўлены маёмасным цэнзам і забяспечваў перавагу памеснага дваранства, што не адпавядала ўмовам заходніх губерняў, дзе царскі ўрад пасля паўстання 1863-1864 гг. праводзіў палітыку эканамічнага падрыву «польскага» землеўладання [4].

Закон 1864 г. не вызначыў адназначна межы дзейнасці земстваў і дзяржаўных органаў губернскай улады. З гэтай прычыны амаль адразу пачалося супрацьстаянне паміж імі, што прывяло да шэрага новых пастаноў, цыркуляраў і законаў, па якіх статус земстваў быў значна звужаны. Ужо ў канцы 70-х гг. XIX ст. земскія дзеячы пачалі ўзбуджаць хадайніцтвы аб прыцягненні да земскай справы большай колькасці мясцовых жыхароў. Урад прызнаваў слушным неабходнасць перапрацоўкі закона 1864 г. Міністр унутраных спраў Н.П. Ігнацьеў у верасні 1881 г. прадставіў Аляксандру III даклад аб неабходнасці распрацоўкі праекта рэформы губернскіх устаноў, а 19 кастрычніка таго ж года - другі даклад па пытанні аб рэформе мясцовага кіравання ў краіне. 20 кастрычніка 1881 г. была створана «Асобая камісія для складання праектаў мясцовага кіравання» (пазней яе часцей называлі Каханаўская камісія, па прозвішчы яе старшыні, члена Дзяржаўнага савета, таварыша міністра ўнутраных спраў М.С. Каханава). У студзені 1885 г. міністр унутраных спраў Д.А. Талсты прадставіў Аляксандру III даклад аб стане спраў і аб рабоце камісіі. Аднак і высновы, да якіх прыйшлі члены камісіі, і новы праект рэформы земскай справы не задаволілі цара. Камісіі далі два месяцы для завяршэння работы. У красавіку 1885 г. яна правяла апошняе пасяджэнне, а яе матэрыялы перададзены ў Міністэрства ўнутраных спраў [5].

Вясной 1886 г. у МУС быў распрацаваны новы праект рэарганізацыі земскага самакіравання. Увосень 1886 г. Д.А. Талсты склікаў Асобую нараду для папярэдняга абмеркавання асноўных пачаткаў пераўтварэння земскіх устаноў і сялянскага самакіравання. У выніку 8 студзеня 1888 г. у Дзяржаўны савет быў унесены праект пераўтварэння земства. У ім былі значна абмежаваны кампетэнцыі і правы земскіх устаноў. Новы закон аб земствах, які значна звузіў іх магчымасці адносна закона 1864 г., быў прыняты 12 чэрвеня 1890 г.

12 красавіка 1899 г. міністр унутраных спраў падаў дзяржаўнаму сакратару запіску, у якой адзначалася: «У цяперашні час самыя значныя патрэбы земскай гаспадаркі ў беларускіх губернях застаюцца амаль без усякага задавальнення: … вельмі нязначнымі з'яўляюцца выдаткі на медыцынскую частку, зусім не адбываецца выдаткаў з земскіх збораў на ўтрыманне народных вучылішчаў, акрамя царкоўна-парафіяльных школ і г. д.» [6, л. 133]. Пры гэтым сялянства беларускіх губерняў выдаткоўвала значныя грошы з мірскіх сум на тыя патрэбы, што задавальняліся ў земскіх губернях менавіта з земскіх збораў, напрыклад, на медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, народную адукацыю і інш. На нарадах у Міністэрстве ўнутраных спраў абмяркоўваліся статыстычныя даныя, паводле якіх «у няземскіх губернях адзначалася выключная нераўнамернасць раскладкі як губернскага земскага збору, так і натуральных павіннасцей», што складалі «адзін з карэнных недахопаў» земскага гаспадарчага жыцця [3, л. 26-26 адв.]. Пры параўнанні мірскіх смет па «земскіх» і «няземскіх» губернях вызначылася, што ў 1893-1894 гг. з сум мірскіх збораў толькі на народную медыцыну і адукацыю выдаткоўвалася грошай у сярэднім у земскіх губернях амаль ў 2-2,5 раза менш, чым у заходніх. У прыватнасці, сяляне беларускіх губерняў у 1893 г. на народную адукацыю выдаткоўвалі у сярэднім па 135,5 тыс. руб., а ў земскіх губ. - па 74,8 тыс. руб., а на медыцыну адпаведна - 24,3 тыс. руб. і 8,4 тыс. руб. на губерню [3, л. 26 адв.]. Гэтая акалічнасць тлумачыцца тым, што ў земскіх губернях выдаткі на адукацыю і медыцыну пакрываліся з земскіх сродкаў, а ў заходніх амаль ўсе прыпадалі на сродкі мірскія, г. зн. утрымоўваліся выключна сялянамі.

Тое, што земская рэформа не праводзілася ў беларускіх губернях, а фактычна сялянства несла асноўны цяжар земскіх павіннасцей і выдаткаў, адбівалася на ўсіх баках жыцця вёскі. Так, пры аналізе выдаткаў на сельскагаспадарчыя патрэбы высветлілася: у земскіх губернях сяляне выдзялялі на іх амаль па 332 тыс. руб. на губерню (24 % ад усіх мірскі; выдаткаў), а ў заходніх губернях - па 108 тыс руб. (12 % ад агульнай сумы мірскіх выдаткаў) Відавочна, што сялянскія таварыствы ў Заходнім краі былі проста не ў стане выдаткоўваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грошы на найбольш для іх важныя патрэбы. За 1892-1894 гг. мірскія зборы складалі ў сярэднім на дзесяціну сялянскай зямлі ў заходніх губернях 47 кап., а ў земскіх - 37 кап. [3, л. 27].

Такое складанае становішча выклікала шматразовыя і шматлікія выказванні аб неабходнасці распаўсюджання земскай рэформы на беларускія губерні. У 1895-1896 гг. гэта пытанне зноў абмяркоўвалася на вышэйшым узроўні. Аднак Міністэрства народнай адукацыі выказалася супраць прапаноў І.Л. Гарамыкіна аб увядзенні земскіх устаноў у заходніх губернях [3, л. 30]. У гэтым жа кірунку выказаліся і іншыя члены нарады.

Таму 22 красавіка 1896 г. Дзяржаўны савет вырашыў дазволіць міністру ўнутраных спраў абмеркаваць і ўнесці ў Дзяржаўны савет свае прапановы аб пераўтварэнні ўстаноў, якія ведалі справамі аб земскіх павіннасцях у губернях, дзе не дзейнічала Палажэнне 12 чэрвеня 1890 г., і аб мерах, якія маглі б садзейнічаць развіццю ў гэтых губернях земскай гаспадаркі. Міністр прапанаваў стварыць камісію для абмеркавання гэтага пытання ў складзе кіраўнікоў міністэрстваў і генерал-губернатараў, што было адобрана Мікалаем ІІ.

Пры абмеркаванні магчымасці тэрытарыяльнага пашырэння земскіх устаноў на заходнія губерні міністр фінансаў С.Ю. Вітэ даказваў немагчымасць прымянення існаваўшага земскага заканадаўства на гэтых тэрыторыях і выступаў за карэннае пераўтварэнне мясцовага самакіравання, якое, на яго думку, уяўляла сабой «нейкае стракатае наслаенне ў спарахнелым падмурку Палажэння аб губернях імператрыцы Кацярыны ІІ» [1, с. 3-4]. Па меркаваннях С.Ю. Вітэ, пры напрамку палітыкі Міністэрства ўнутраных спраў на змяншэнне паўнамоцтваў земстваў у духу Палажэння 1890 г., прапанова Міністэрства аб увядзенні земскіх устаноў на ўскраінах не адпавядала ўжо зробленаму і будучаму «ўпарадкаванню» земскай справы. Гэта неадпаведнасць была тым больш відавочнай, што па палітычных меркаваннях у «будучых земствах Заходняга краю мяркуецца ўзмацніць усе тыя недахопы, якія ўласцівы для існуючых земстваў губерняў унутраных; мяркуецца адразу пачаць з уладкавання адной толькі знешняй беззмястоўнай абалонкі. Праект мае на ўвазе, што ў мэтах аб'яднання дзейнасці будучых земскіх устаноў з органамі ўрада, магчыма пазбавіць іх усякай, нават прывідлівай, самастойнасці, паставіўшы іх у поўнае падпарадкаванне органам урада і карэнным чынам змяніць прынятае для ўнутраных губерняў уладкаванне. Такім чынам, гэта азначае, што мяркуецца недасканалая бюракратычная арганізацыя, але з захаваннем ідэі самакіравання. Калі земствы, што існуюць, з'яўляюцца ў нас будынкам без даху і без падмурку, то … можна казаць, што праектуемыя на ўскраінах земствы будуць пазбаўлены нават і сцен, бо ні сваіх выканаўчых органаў, ні павятовых земскіх устаноў у іх не будзе» [1, с. 177-178].

І.Л. Гарамыкін прыводзіў шэраг аргументаў на карысць правядзення земскай рэформы ў Заходнім краі: «1) Заходні край - калыска рускай народнасці, рускай дзяржаўнасці, мовы, веры; 2) умацаванне рускага ўплыву ў краі і 3) прадстаўленне магчымасці рускім мясцовым земствам скласціся ў краі ў вызначаную свядомую грамадскую сілу» [1, с. 177-178].

С.Ю. Вітэ ў запісцы «Самадзяржаўе і земства» выказаў свае меркаванні адносна ўвядзення земстваў у беларускіх губернях. Ён адзначаў, што сярод прыватных уладальнікаў, якія па памерах зямлі ў іх маглі б прыняць удзел у земскіх выбарах, каталікі складалі пераважную большасць [1, с. 178-179]. Землеўладальнікі «польскага паходжання», па меркаванні МУС, надавалі «польскую афарбоўку агульнаму характару мясцовай неслужылай інтэлігенцыі», у той час як рускія ў пераважнай большасці ў маёнтках не пражывалі і вялі гаспадарку праз кіраўнікоў, нярэдка з ліку мясцовых палякаў ці нават чужаземцаў. Акрамя таго, сярод рускіх землеўладальнікаў быў немалы працэнт асоб, якія набылі маёнткі не для таго, каб грунтоўна ў іх уладкавацца, а толькі ў мэтах перапродажу зямлі па частках сялянам. Нарэшце, рускія землеўладальнікі, большасць з якіх валодала землямі не больш за 20-30 гадоў, уяўлялі разрозненую масу, складзеную з самых разнастайных грамадскіх элементаў і пазбаўленую адзінства. Між тым польскі памешчыцкі клас, які валодаў маёнткамі здаўна, на думку С.Ю. Вітэ, уяўляў згуртаванае аднароднае асяроддзе, некаторыя асобы якога былі звязаны паміж сабой даўнімі адносінамі роднасці, суседства, традыцый. Дзякуючы гэтым прычынам, польскі памешчыцкі клас, хаця і меншы па колькасці, чым рускі, пераўзыходзіў яго па сіле і грамадскім значэнні [1, с. 179]. Міністэрства ўнутраных спраў непакоіла магчымасць палітычнай агітацыі ў выпадку закліку насельніцтва да кіравання мясцовымі справамі: «Утоеная незадаволенасць, якая, відавочна, хаваецца ў масе польскага насельніцтва і асабліва ва ўладальніцкіх яго класах і непазбежна падтрымліваецца тымі выключнымі мерамі, якія, з-за дзяржаўнай неабходнасці, выкарыстоўваюцца і доўгі час яшчэ павінны будуць выкарыстоўвацца ў краі, можа пры вядомай схільнасці палякаў да захапленняў знайсці выйсце ў непажаданых сярод павятовых сходаў дэманстрацыях палітычнага характару, што сапсуюць усю справу» [1, с. 179]. З гэтай прычыны Міністэрства ўнутраных спраў праектавала такую арга-

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

нізацыю земстваў, каб не дапусціць у іх «пераважаючы ў краі польскі элемент».

У красавіку-маі 1901 г. адбыліся новыя пасяджэнні па абмеркаванні пытання аб пашырэнні земскай рэформы на беларускія губерні. Міністр унутраных спраў Дз.С. Сіпягін адзначаў, што ў законе 1890 г. мелася шмат недакладнасцей і неабходна змяненне заканадаўства. Аб тым, ці трэба распаўсюджваць земскую рэформу ў такім выглядзе на беларускія губерні, міністр унутраных спраў выказаўся адназначна: увядзенне земстваў палітычна небяспечна з-за ўплыву «польскага элемента», што «ўмовы мясцовага і палітычнага жыцця дзевяці заходніх губерняў» выклікаюць «самыя сур'ёзныя сумненні ў магчымасці ўвядзення ў іх выбарных земскіх устаноў» [3, л. 40-46].

Новыя эканамічныя і палітычныя абставіны ў імперыі і ў свеце паказалі неабходнасць рэарганізацыі справы ў вёсцы. Таму 21 студзеня 1902 г. урад абвясціў аб стварэнні Асобай нарады аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці [7]. Гэта ўзбудзіла вялікі рэзананс на месцах. Ствараліся мясцовыя нарады, якія адказвалі на пытанні праграмы, распрацаванай урадам, выказвалі свае думкі і меркаванні па многіх праблемах, выносілі прапановы.

У прыватнасці, Магілёўскі губернскі камітэт сцвярджаў: «Пажадана вызваленне сялян ад выключнага нясення выдаткаў на ўтрыманне такіх устаноў, якія абслугоўваюць і іншыя саслоўі, і ад выдаткаў на задавальненне агульных земскіх патрэбнасцей. ...Змяненне існуючага парадку загадваннем земскай гаспадаркай прызнаецца настолькі неабходным, што, на думку Камітэта, усе мерапрыемствы, накіраваныя на ўздым сельскагаспадарчай прамысловасці, могуць быць праведзены ў жыццё толькі пры ўмове ўвядзення ў Магілёўскай губерні земскай рэформы» [8, с. 18, 20].

За стварэнне дробнай земскай адзінкі, якая менш чым павет, «для больш паспяховай і карыснай» дзейнасці земства выказваўся Полацкі камітэт Віцебскай губерні [9]. Камітэты Мінскай губерні таксама выказваліся за земскую рэформу: «Было б пажадана, каб [земскае Палажэнне ] было ўведзена ў Мінскай губерні» [10]. У цэлым пераважная большасць удзельнікаў работы мясцовых камітэтаў выказвалася за неабходнасць пераўтварэнняў, за распаўсюджанне земскага заканадаўства 1890 г. на заходнія губерні.

Усе высновы, да якіх прыходзілі члены мясцовых камітэтаў, былі абагульнены і прааналізаваны. Урад не мог ігнараваць такое аднадушнае памкненне. У выніку было прынята рашэнне не ўводзіць у 13 губернях земскія ўстановы і захаваць парадак, які існаваў на той час, адносна кіравання земскімі справамі пад непасрэдным кіраўніцтвам губернатараў, ліквідаваць існаваўшыя ў ім недахопы карэнным чынам, рэфармаваць органы земскага кіравання з прыцягненнем у іх склад у якасці галосных прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва. Па загадзе Мікалая II Міністэрствам унутраных спраў сумесна з Міністэрствам фінансаў быў складзены праект Палажэння аб гаспадарчым кіраванні ў нядземскіх губернях. Затым праект быў разгледжаны на нарадзе з удзелам прадстаўнікоў ад ведамстваў, 13 начальнікаў губерняў, кіраўнікоў казённых палат і ўнесены на разгляд у Дзяржаўны савет.

У выніку 2 красавіка 1903 г. Мікалай II падпісаў Палажэнне аб кіраванні земскай гаспадаркай у губернях Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Падольскай. Пры гэтым Дзяржаўны савет, на падставе меркаванняў Міністэрства ўнутраных спраў і з адабрэння цара, вырашыў гэты закон «увесці ў дзеянне ў губернях Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай на працягу 1903 г., даўшы магчымасць Міністру ўнутраных спраў вырашыць пытанне адносна часу ўвядзення [яго] у губернях Віленскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай і Падольскай...» [11, с. I]. Такім чынам, у Віленскай, Гродзенскай і Віцебскай губернях заставалася ранейшае ўладкаванне.

*ЛіТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ*

1. *Витте, С.Ю.* Самодержавие и земство. Записка бывшего министра финансов статс-секретаря гр. С.Ю. Витте. Предисл. Череванина. - СПб.: Тип-я В. Безобразов и К, 1908. - VII, 211 с; [1] - С. 64-65.
2. Земские учреждения // Энциклопедический словарь. - Т. XII А. Земпер-Имидокислоты. - СПб.: Типо-литография И.А. Ефрона, 1894. - С. 533-534.
3. Дело о преобразовании учреждений, ведающих дела земского хозяйства в губерниях Архангельской, Астраханской, Виленской, Витебской, Волынской, Гродненской, Киевской, Ковенской, Минской, Могилевской, Оренбургской, Подольской и Ставропольской // РДГА ў Санкт-Пецярбургу. - Фонд 1149. - Воп. 13, 1901 г. - Спр. 183. - Л. 1.
4. *Забаўскі, М.М.* Дзяржаўная дума ў палітычным жыцці Беларусі (1906 -1907 гг.) - Мінск: БДПУ, 1993. - С. 16 - 17; *Яноўская, В.* Усталяванне палітычнай рэакцыі. Барацьба «заходнерускіх» і польскіх нацыяналістычных груповак з беларускім нацыянальным рухам. Увядзенне земстваў / В. Яноўская// Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII - пачатак XX ст.) / М. Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. - Мн.: Экаперспектыва, 2005. - 519 с; іл. - С. 390.
5. *Жукова, Л А.* Земское самоуправление и самодержавие в конце XIX - начале XX века / Л.А. Жукова // Земское самоуправление в России, 1864-1918. В 2 кн. Кн. 1:1864-1904/ отв. ред. Н.Г.Королева; Ин-т рос. истории РАН. - М.: Наука, 2005. - 428 с. - С. 247.
6. Записка Министра внутренних дел г-ну Государственному Секретарю. 12 апреля 1899 г. № 4824 // Дело о распространении законоположений 12 июля 1889 г. о преобразовании крестьянских учреждений на Витебскую, Минскую и Могилевскую губернии. - РДГА ў Санкт-Пецярбургу. - Фонд 1149. - Воп. 13, 1900 г. - Спр. 82. - Л. 133.
7. Правительственный вестник. - 1902. - № 20. - 24 янв.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

8. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности - СПб.: Государственная типография, 1903. - Т. XXII. Могилёвская губерния. - 167 с. - С. XVIII, XX.
9. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности- СПб.: Типогр. В. Киршбаума, 1903. - Вып. V. Витебская губерния. -VI, 534 с. - С. 397.
10. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. - СПб.: Типография И.Гольдберга, 1903. - Т. XXI. Минская губерния. -VIII, 435 с. - С. 203-204.
11. Высочайше утвержденное 2 апреля 1903 г. Положение об управлении земским хозяйством в губерниях Виленской, Витебской, Волынской, Гродненской, Киевской, Ковенской, Минской, Могилевской и Подольской / Издание хозяйственного департамента МВД (второе). - СПб.: Типография МВД, 1904. // ПСЗРИ. - Собр. 3-е. - Т. 23. - Отд. 1. - № 22757.

*SUMMARY*

*The article deals with the struggle around the zemstvo reform' being carried out in Belarusian lands. The political reasons for the delay in the realization of the reform in Belarus is being analyzed there. The opinions of the government circles towards the spread of zemstvo' in the North-Western land in 1859-1903 years is shown in the article. The evolution of the government position on the above problem is also being analyzed.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ